# ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫЗНАЧЭННІ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ ЯК ІНСТЫТУТА САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПАМЯЦІ

***І. І. Бамбешка,***
*старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Сусветная прафесійная музейная супольнасць характарызуе музей як «некамерцыйную, пастаянную ўстанову, якая служыць грамадству і яго развіццю, адкрытую для публікі, якая набывае, захоўвае, даследуе, перадае і дэманструе матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну чалавецтва і навакольнага асяроддзя з мэтай адукацыі, асветы і атрымання асалоды». Такое вызначэнне зафіксавана ў Статуце ІКОМа ў 2007 г. [7]. Аднак гэта не ўніверсальнае вызначэнне. Доказам таму – наяўнасць значнай колькасці разнастайных канцэпцый, кожная адлюстроўвае асаблівасці падыходу да вызначэння сутнасці музея. Расійскія музеязнаўцы С. В. Пшанічная і В. У. Бяззубава прааналізавалі розныя меркаванні і прыйшлі да высновы, што найбольш распаўсюджаныя характарыстыкі музея – гэта ўспрыманне музея як навукова-даследчай і адукацыйнай установы (Ё. Бенеш, І. Няўступны, Э. Ласаль, Д. І. Твярская, І. В. Бястужаў-Лада, М. Азёрная); погляд на музей як праяўленне спецыфічнага стаўлення чалавека да рэчаіснасці, якое рэалізуецца сродкамі надання аб’ектам навакольнага асяроддзя такой выключнай якасці, як «музеяльнасць» (З. Странскі, Г. Грэгарава, Л. Я. Пятруніна); прэзентацыя музея як камунікатыўнай сістэмы (Д. Камерон, І. У. Іксанава). Музей разглядаецца як культурная форма (Т. П. Калугіна), як механізм культурнага наследавання (М. С. Каган, З. А. Бонамі, У. Ю. Дукельскі), як рэкрэацыйная ўстанова (Д. А. Хадсан, Дж. Макдональд, Д. А. Равіковіч, Ю. У. Гуральнік, Ю. Ромедэр) [1; 4]. Такім чынам, сучасная музеялогія падае шырокі спектр меркаванняў і канцэпцый – ад вузкага разумення музея як установы з канкрэтнымі функцыямі да больш шырокага ўспрыняцця музея як фактара сацыякультурнага развіцця. Тым не менш усе прыведзеныя характарыстыкі ў пэўнай ступені раскрываюць сут-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць музея як феномена культуры і інстытута сацыякультурнай памяці.

Гістарыяграфічны аналіз літаратуры аб сутнасці краязнаўчых музеяў сведчыць, што вызначэнне краязнаўчых музеяў нельга лічыць дастаткова распрацаваным. У айчынным музеязнаўстве тэрмін «краязнаўчы» з'яўляецца тады, калі музей характарызуецца з пункту гледжання яго профілю. Мы разумеем пад профілем музея яго спецыялізацыю, абумоўленую сувяззю з канкрэтнай навукай ці відам мастацтва, тэхнікай, вытворчасцю і яе галінамі. Сярод профільных груп вылучаюць музеі комплекснага профілю, іх дзейнасць звязана з некалькімі навуковымі дысцыплінамі ці галінамі ведаў. Самую шматлікую групу сярод іх утвараюць менавіта краязнаўчыя музеі. Наяўнасць прадметаў розных тыпаў у фондах краязнаўчых музеяў дазваляе суадносіць іх з шэрагам навуковых дысцыплін: гісторыяй (археалогія, этнаграфія, нумізматыка, сфрагістыка і інш.), мастацтвазнаўствам, літаратуразнаўствам, батанікай (разам з палеабатанікай), заалогіяй (разам з палеазаалогіяй), мінералогіяй, глебазнаўствам і інш. Падобныя музеі маюць прамое ці ўскоснае дачыненне да ўсіх сфер жыцця канкрэтнага рэгіёна, таму аб'ектыўна ад музея патрабуецца фіксацыя змен і новых тэндэнцый у сацыякультурным (і не толькі) развіцці рэгіёна. Экспазіцыя краязнаўчых музеяў стварае вобраз пэўнага месца музейнымі сродкамі. Менавіта такое разуменне краязнаўчага музея дазволіла расійскім даследчыкам характарызаваць краязнаўчыя музеі як музеі, зборы якіх дакументуюць розныя бакі жыцця (прыродныя ўмовы, гістарычнае развіццё, эканоміку, побыт, культуру) канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна ці населенага пункта (рэспублікі, края, акругі, вобласці, горада, раёна, вёскі) і складаюць частку яго прыроднай і культурнай спадчыны [5, с. 298].

Аднак, на нашу думку, найбольш перспектыўным для вызначэння сутнасці краязнаўчага музея з'яўляецца разгляд яго з культуралагічнага пункту гледжання праз прызму катэгорыі памяці. Вядомы французскі гісторык П. Нора слушна заўважыў, што музей мае дачыненне «да базавых інструментаў гістарычнай работы і да найбольш сімвалічных аб'ектаў нашай памяці» [2, с. 26].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя музеі, з аднаго боку, – гэта адна з інстытуцый, здольных фарміраваць калектыўную гістарычную памяць лакальнага соцыуму, што надзвычай важна ў сучасных умовах глабалізацыі. У іх акумулюецца і прэзентуецца апрадмечаная памяць многіх пакаленняў, якія жылі на канкрэтнай тэрыторыі, іх назапашаны і асэнсаваны вопыт. Кожнае новае пакаленне ў цэлым і асоба ў прыватнасці засвойваюць матэрыяльную, нематэрыяльную, прыродную спадчыну лакальнага соцыуму. Гэты шлях сацыяльнай і духоўнай адаптацыі вядомы чалавецтву з самых старажытных часоў, бо ўзнаўленне роду як адзінага цэлага ўключае не толькі фізічнае ўзнаўленне, але і духоўнае, што азначае магчымасць перадачы ўменняў і навыкаў, традыцый, звычаяў і абрадаў, выхаванне пачуцця прыналежнасці да сям'і, роду, нацыі і г. д. [6, с. 10].

З другога боку, краязнаўчы музей выступае як сродак фарміравання асабістай (індывідуальнай) памяці (антрапалагічных рэмінісцэнцый, калі ўжыць тэрмін, выкарыстаны расійскім даследчыкам А. У. Пятровым) праз візуальна-прасторавыя формы музейнай камунікацыі (музейную экспазіцыю і музейную выстаўку) і праз асобныя музейныя прадметы [3, с. 68].

Такім чынам, у дачыненні да сацыякультурнай памяці краязнаўчы музей адыгрывае дваякую ролю: па-першае, дазваляе яе захоўваць, актуалізаваць і трансляваць наступным пакаленням, а па-другое, краязнаўчы музей актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні сацыякультурнай памяці лакальнага соцыуму і яе развіцці.

Акумуляваны досвед стаў падставай для распрацоўкі ўласнага канцэптуальнага вызначэння краязнаўчага музея як гістарычна абумоўленага шматфункцыянальнага і комплекснага інстытута сацыякультурнай памяці, сродкамі якога рэалізуецца грамадская патрэба ў захаванні, інтэрпрэтацыі і трансляцыі наступным пакаленням гісторыка-культурнай спадчыны лакальнага соцыуму.

1. *Беззубова, О. В.* Некоторые аспекты теоретического осмысления музея как феномена культуры / О. В. Беззубова // Триумф музея? : сб. ст. / С.-Петерб. гос. ун-т, Гос. Эрмитаж. – СПб., 2005. – С. 6–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Нора, П.* Проблематика мест памяти / П. Нора // Франция-память [Текст] / С.-Петерб. гос. ун-т ; [Пьер Нора [и др.] ; пер. с фр. Д. Хапаевой]. – СПб., 1999. – С. 17–50.

3. *Петров, А. В.* Историко-краеведческий музей как феномен актуализации способности человека к вызыванию воспоминаний / А. В. Петров // Музей – памятник – наследие. – 2017. – № 2. – С. 67–76.

4. *Пшеничная, С. В.* Концептуальная модель музея как теоретическая основа подготовки музейных кадров / С. В. Пшеничная // Музей и образование : сб. науч. тр. / Рос. этногр. музей [и др.] ; науч. ред. С. Т. Махлина. – СПб., 1999. – С. 52–65.

5. *Размустова, Т. О.* Краеведческие музеи / Т. О. Размустова, А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия : в 2 т. – М., 2001. – Т. 1. – С. 298–301.

6. *Шляхтина, Л. М.* Социальные практики современного музея : границы доступности / Л. М. Шляхтина // Вопросы музеологии. – 2014. – № 2 (10). – С. 10–15.

7. Museum Definition [Electronic resource] // ICOM / The world museum community. – Рэжым доступу: https://icom.museum/en/activities/standards-guidelines/museum-definition/. – Дата доступу: 27.09.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕКЛАМА УЧРЕЖДЕНИЙ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ В ИНФОРМАЦИОННОМ ПРОСТРАНСТВЕ

***Т. В. Бачурина,***
*старший преподаватель кафедры информационные технологии в культуре Белорусского государственного университета культуры и искусств;*

***О. М. Кунцевич,***
*старший преподаватель кафедры информационные технологии в культуре Белорусского государственного университета культуры и искусств*

В настоящее время система высшего образования в Республике Беларусь стремительно развивается, что приводит к большим изменениям, которые вынуждены учитывать высшие учебные заведения. Финансирование высших учебных заведений зависит в том числе и от количества обучающихся студентов, что ведет к прямой конкуренции среди вузов. Кроме того, появляются коммерческие высшие учебные заведения, которые предлагают образовательные услуги по востребованным специальностям. Нельзя не сказать и о демографическом спаде,